в двух километрах от границы, сдерживала врага до 12 часов. Насмерть стояли пограничники 7-й, 8-й, 10-й, 11-й, 14-й, 15-й, 18-й застав, в живых остались единицы, но никто из них не отошел без приказа.

Яростное сопротивление врагу оказали пограничники 88-го Шепетовского погранотряда: пограничники 5-й, 6-й, 7-й, 8-й, 9-й и 13-й застав. Храбро сражались с врагом пограничники 2-й заставы лейтенанта Н.П.Евсенкова, 8-й заставы старшего лейтенанта Я.Г.Лебедя, резервной заставы младшего лейтенанта Г. А. Кирнича.

Маршал Советского Союза С. С. Бирюзов в своих воспоминаниях так определил роль пограничников в войне: «Славные пограничные войска, приняв на себя удар гитлеровских полчищ, проявили изумительную стойкость, несгибаемое мужество и массовый героизм и внесли достойный вклад в дело разгрома фашистских захватчиков. Подвиги пограничников бессмертны». Мы обязаны помнить и гордиться теми, кто защищал нас.

*Кропа Аляксандр Віктаравіч*

## ВОГНЕННЫ ТАРАН НА АШМЯНШЧЫНЕ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Ваенная кафедра

Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык ваеннай кафедры ГрДМУ, падпалкоўнік м/с Ляскевіч К.Л.

Мая Беларусь… Па нашых землях тапталіся прышэльцы, ворагі. Прыходзілі да нас з дзідамі і мячамі, з ружжамі і гарматамі, на танках і самалётах. Нішчылі людзей, палілі хаты, гарады, адбіралі скарбы… Цяпер для нас усё гэта мінулае. Мінулае… Яно ніколі не праходзіць бясследна. Асабліва калі гэтае мінулае – ВАЙНА.

Вялікая Айчынная вайна была самай цяжкой вайной, у якой змагаліся нашы суайчыннікі. З першых яе дзён Чырвоная Армія праяўляла масавы гераізм, імкнучыся спыніць рух ворага.

Репозиторий ГрГМУ

Не заставаліся ўбаку і ваенна-паветраныя сілы. Шырокае распаўсюджванне атрымалі тараны, з дапамогай якіх знішчалася вялікая колькасць жывой сілы і тэхнікі праціўніка.

Гісторыя авіяцыі ведае два віды таранаў – паветраны і агнявы (вогненны). У першым выпадку лётчык, выкарыстаўшы боезапас, сваёй машынай імкнецца збіць варожы самалёт, у другім – машынай паражае наземныя аб’екты.

У гады Вялікай Айчыннай вайны было здзейснена 596 паветраных таранаў, 506 – вогенных. Таранныя ўдары з’яўляліся неад’емнай часткай агульнай барацьбы савецкіх людзей супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яны былі не прадугледжаны воінскім уставам. Савецкія лётчыкі ішлі на таран не па загадзе, а толькі у надзвычайных сітуацыях і рашаліся на такі подзвіг вынослівыя, смелыя майстры пілатавання.

Вядома, што 26 чэрвеня 1941 года капітан Мікалай Гастэла здзейсніў на падбітым самалёце таран механізаванай калоны варожай тэхнікі. Подзвіг Гастэлы, дзякуючы савецкай прапагандзе, стаў адным з самых праслаўленых у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Але Гастэла быў не першым, хто здзейсніў «вогненны таран». Менавіта такі таран на Ашмянчыне здзейснілі лётчыкі А. М. Аўдзееў і П. П. Страленка.

Аляксандр Аўдзееў нарадзіўся ў 1906 годзе ў вёсцы Новалугавое Жэрдзеўскага раёна Тамбоўскай вобласці. Камсамолец-актывіст у 20-я гады быў арганізатарам першых піянерскіх атрадаў на Арлоўшчыне, дапамагаў вырашаць лёс дзясяткаў беспрытульных дзяцей. Вучыўся ў будаўнічым тэхнікуме. У 1928 годзе па камсамольскай пуцёўцы паступіў у школу Ваенна-Паветраных сіл СССР. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў ужо намеснікам камандзіра эскадрыллі 43-га блізка-бамбардзіровачнага авіяпалка, дыслацыраванага ў Беларусі. Разам з сям’ёй жыў у Віцебску. Аляксандр Аўдзееў заўсёды быў рашучым, смелым, таварыскім чалавекам, аддданым сваёй справе. «Я не могу жить без товарищей, без неба, – писал отстранённый на время от полётов из-за аварии самолёта А. Н. Авдеев. – Если потребуется за Родину, отдам всё, даже жизнь…»

Пётр Страленка нарадзіўся ў 1913 годзе ў вёсцы Вяршына-Мурзінка Аляксанраўскага раёна Кіраваградскай вобласці ў



Репозиторий ГрГМУ

мнагадзетнай сям'і, быў пятым дзіцем. Хлопец з дзяцінсва быў вясёлым, дружалюбным, знаходлівым, кемлівым, кантактным, працавітым. У школе вучыўся добра. Быў камсамольцам. Да вайны працаваў у трактарнай брыгадзе ў калгасе, цікавіўся тэхнікай, марыў стаць лётчыкам. Пасля арміі Пётр закончыў авіяцыйнае вучылішча, служыў у Беларускай ваеннай акрузе. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны. У чэрвені 1941 года – начальнік сувязі эскадрыллі, лётчык-назіральнік (штурман) на тэрыторыі Беларусі. Пра яго аднавяскоўцы і сябры казалі як пра багатага душой чалавека. Адапалчане расказалі, што калі Пётр упершыню скакаў з парашутам, то спяваў: «И тот, кто с песней по жизни шагает, тот никогда и нигде не пропадёт». А затым кіраўніку па скачках даклаў, што добра прызямліўся з песняй. Як чалавек Пётр меў пачуццё гумару, карыстаўся аўтарытэтам у сяброў, адказна адносіўся да службы.

Капітан Аўдзееў і лейтэнант Страленка лямалі ў адным экіпажы на самалёце СУ-2 і не вярнуліся з баявога задання 25 чэрвеня 1941 года.

25 чэрвеня 1941 года гітлераўцы занялі беларускі горад Ашмяны. Звяно бамбардзіроўшчыкаў капітана Аўдзеева атрымала заданне на бамбёжку калон 39-га нямецкага механізаванага мотамехакорпуса, які накіроўваўся ў Мінск. Бамбардзіроўшчыкі ішлі брыючым палётам, набліжаліся да шашы, па якой ехалі варожыя танкі і аўтамашыны. Паўсюль узрываліся снарады зенітак. Але Аўдзееў настойліва вёў самалёты на цэль, націскаючы толькі на кнопку электраскідальніка – і варожая калона праціўніка танула ў разрывах. Штурман Страленка падтрымліваў куямётнай чаргой. Але раптам самалёт страсянула ўзрыўной хваляй – і ў кабіне запахла гарэлым маслам. Задыміўся рухавік. Самалёт камандзіра падбілі. Баявыя сябры стараліся адцягнуць увагу праціўніка на сябе. Капітан Аўдзееў, зрабіўшы круг над шашой, накіраваў свой чырвонасцяжны бамбардіроўшчык уніз, у мотакалону ворага. Лейтэнант Страленка выпускаў апошнія боепрыпасы. Але трэба было імгненна прыняць рашэнне. І баявыя таварышы пачулі ў навушніках голас Пятра Страленкі :

Ідзём на таран! Бывай, Радзіма!

Репозиторий ГрГМУ

Ахоплены полымем, але накіраваны цвёрдай рукой, самалёт урэзаўся ў мотакалону. Моцны ўзрыў страсянуў паветра – і лётчыкі Аляксандр Аўдзееў і Пётр Страленка адышлі ў бессмяротнасць. Гэта адбылося на дарозе Ашмяны–Валожын [3].

Сведкі, у прыватнасці жыхар вёскі Солы Г. К. Барышэўскі ўспамінаў, што 25 чэрвеня 1941 года прыблізна а 12 гадзіне немцы ўвайшлі ў Солы. За кіламетр ад вёскі сабралася вялікая колькасць нямецкіх танкаў. Нечакана ў небе паказаліся тры савецкія бамбардзіроўшчыкі. Фашысты пачалі страляць. Адзін з самалётаў загарэўся, але накіраваўся на танкі. Раздаўся выбух. Лётчыкам выратавацца не ўдалося. Праз некатры час мясцовыя жыхары сярод абломкаў самалёта знаходзілі іх астанкі.

Рух фашыстаў быў спынены на тры гадзіны. Сваім подзвігам лётчыкі затрымалі ворага і далі магчымасць нашым войскам заняць выгадную абараняльную пазіцыю.

Капітан Аўдзееў паспеў здзейсніць толькі 10 баявых вылетаў і геройскі загінуў. У 1965 годзе ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені (пасмяротна).

Сваім подзвігам Аўдзееў і Страленка заслужылі, каб іх не забылі. Цяжкім быў ваенны час, затраціўя ўзнагародны матэрыял. Доўга заставалася невядомай магіла лётчыкаў. Але сёння на мемарыяльных дошках, якія вісяць на помніках у вёсцы Гальшаны і ў горадзе Ашмяны, ёсць імёны лётчыкаў. А на месцы гібелі Аўдзеева і Страленкі стаіць помнік. Даведацца пра лётчыкаў-герояў можна ў краязнайчых музеях, якія знаодзяцца ў агагарадку Гальшаны і горадзе Ашмяны: гісторыка-краязнаўчы народны музей імя Эдуарда Корзуна і «Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф. К. Багушэвіча».

А яшчэ іх імёнамі названы вуліцы на радзіме і ў Ашмянах.

Мужна змагаліся і паміралі савецкія лётчыкі. Пра лётчыкаў, якія здзяйснялі подзвіг, высока адзываўся камандуючы ВПС Савецкай Арміі, двойчы Герой Савецкага Саюза, Галоўны маршал авіяцыі А. А. Новікаў. Пра таран ён сказаў, што «гэта перш за ўсё гатоўнасць да самаахвярнасці, апошняе выпрабаванне на вернасць свайму народу, сваім ідэалам. Гэта адна з найвышэйшых форм праяўлення таго самага фактара, які характэрны савецкаму чалавеку і якога не ўлічыў, ды і не мог улічыць вораг».

Репозиторий ГрГМУ

Вывучэнне шматлікіх выпадкаў прымянення тараннага ўдару ў гады Вялікай Айчыннай вайны не траціць сваёй актуальнасці і ў нашы дні. Бессмяротныя подзвігі лётчыкаў адыгрываюць важную ролю ў выхаванні новых пакаленняў вынослівых і адважных абаронцаў Радзімы. Моладзь бярэ прыклад з лётчыкаў, якія здзяйснялі таран, вучыцца ў іх, як трэба любіць Радзіму, як яе абараняць, калі над ёй навісне пагроза.

І хоць вайна засталася дзесьці там, у мінулым, але ваенныя падзеі не настолькі далёкія, бо жывуць ветэраны, стаяць абеліскі. І жыве памяць. І гэта памяць не дае нам права забываць аб тых, хто ваяваў і хто аддаў жыццё за Айчыну, за нас.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

1. Памяць: Гіст. – дакум. хроніка Ашмянскага раёна. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – 688 с.:іл.

2. Корзун Э.С. Гольшаны / Э.С. Корзун, Ю.И. Николаев. - Минск: Беларусь, 2005. – 133 с.

3. Матэрыялы гісторыка - краязнаўчага народнага музея імя Эдуарда Корзуна.

4. Матэрыялы «Ашмянскага краязнаўчага музея імя Ф.К. Багушэвіча».

***Кухоцковолец Дарья Юрьевна***

## ПИНСКАЯ ФЛОТИЛИЯ И ЕЁ УЧАСТИЕ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ

УО «Гродненский государственный медицинский университет»
Кафедра социально-гуманитарных наук

Научный руководитель – к.и.н., заведующий кафедрой социально-гуманитарных наук Ситкевич С.А.

Пинская военная флотилия была создана 17 июля 1940 года. В нее вошли суда расформированной Днепровской военной флотилии и польского речного флота, оставленные экипажами осенью 1939 года при вводе частей Красной Армии на территорию Западной Беларуси. Главной базой являлся город Пинск, тыловой – Киев. К началу войны флотилия включала: 78 орудий береговой артиллерии, 14 самолетов, роту морской



Репозиторий ГрГМУ